Жыве Беларусь!

ПРУЖАНСКАЕ ВЕЧА

№ 1 Незалежная грамадска-палітычная газета Пружаншчыны жнівень 1993 г.

ПРАЦЯГ ВЯКОЎ

На белай капусці чырвоны вогнік
Ад хвосці падступнага меча.
Бел-чырвона-белы бацька сцяг
Сцелле ці смутные вечы.

На вечы.
Дзе ў вечаркі мусім спытаць,
Ці нам даставацца народам,
Ці толькі аб'ядні людзей спытаць
І пабянуць, і глыбіцца ў одум.

Ці цяж у агульным застолі людзей
Поблізу ля покуцця сесці.
Ці ціха чакаць, каб які добрадзей
Наш хлеб не пярочыў нам есці.

Ульлёск, як крык, ці крымяцціх насыцях
І пагань ідзе ў прадонне.
Бел-чырвона-белы крыніцы сцяг
У вечным палонені Пагоні!

Рыгор Барадулін.

Шаноўнае спадарства!

Вы трымаеце першы нумар незалежнай грамадска-палітычнай газеты Пружаншчыны.

Як тлумачна пераканаемся не заспавальнай, калі ўзгадаць такога выдання подзвіжніка, бо амаль увесь рэспубліканскі друк (газеты «Рэспубліка», «Сем дней», «Советская Белоруссия», «Знамя юности», «Белорусская нива») знаходзіцца ва ўтрыманні і пад кантролем прамакамуністычнага ўрада Кебіча. А нядаўна мясцовыя ўлады па ўказцы згаданага ж урада прыбралі да сваіх рук раённыя газеты. Такі ж лёс напаткаў і нашы «Раённые будні», якія забраў грыф «Орган Пружанского районного Совета народных депутатов». Каждый какучы, зноў ідзе закон другу ачуняўшыні ад перыфічнай разгубленасці бальшавіцкіні структурамі. За грошы падатковладальчыкаў, за нашы з вамі грошы яны замаўляюць сваю палітычную музыку у газетах, на радыё і тэлебачанні. Дык хіба можна пры такіх умовах атрымліваць аб'ектыўную інфармацыю?

А цяпер, якой бачыцца наша газета, якія публікацыі будуць вызначаць яе пазіцыі і нацы «Раённые будні», якія забраў грыф «Орган Пружанского районного Совета народных депутатов». Каждый какучы, зноў ідзе закон другу ачуняўшыні ад перыфічнай разгубленасці бальшавіцкіні структурамі. За грошы падатковладальчыкаў, за нашы з вамі грошы яны замаўляюць сваю палітычную музыку у газетах, на радыё і тэлебачанні. Дык хіба можна пры такіх умовах атрымліваць аб'ектыўную інфармацыю?

Перш за ўсё ставіцца на мяце асвятленню найбольш хвалюючых грамадскасць пытанняў узаемадносін паміж жыхарствам раёна і мясцовай камуністычнай уладай. Газета будзе рашуча выступаць у абарону правоў і годнасці беларускага народа, паказваць сапраўдныя аблічча тых, хто для ўласнага дабрабыту ганьбіць незалежнасцю Беларусі. Наша выданне будзе садзейнічаць знаходжанню кантактаў паміж людзьмі дэмакратычных поглядаў, што не прымаюць антычалавечай бальшавіцкай ідэалогіі. На старонках газеты будуць асвятляцца пытанні беларускага нацыянальнага адраджэння, культурнага жыцця і гісторыі роднага краю.

Свой першы нумар мы выдалі на сродкі ініцыятараў.

Мы спадзяемся, што з вашай дапамогай, шаноўныя чытачы, мы зможам хоць адзін раз у месяц выдаваць газету.

Рэдкалегія.

Коратка аб усім

Як стала вядома, расейскія ваенныя часткі выводзяцца з ракетных баз, што ніяк Ружан, Шчучына і Куналіно. І дзякуй Богу. Але па распараджэнні старшыні Сяр-Міна Кебіча іх тэрыторыя з забудовамі перадаюцца Міністэрству ўнутраных спраў пад турмы. Тры турмы на вёсці раён — ці не занадта?

Прамаўчым?

✦ ✦ ✦

Толькі на другой сесіі і то ў пафіцыйным галасаванні з першага усяго ў вёсці голас быў заданы дзяўчынай прыдзячнасці да крымінальнай шляхецкасці дэпутата-дырэктара маслазаводу Семянчука С. Д. за махінарства маслам. Дэпутаты-намеклатурщікі сакрэтарыя ратавалі свайго таварыша.

✦ ✦ ✦

Пасля прамерці падыпалода Галоўным упраўленнем земляробчага Капітэлю па Брэсцкай вобласці дырэктар Чурбанаў Н. У. ліквідаваны сваё пасада. Не дапамагалі хітрыя і рабочыя «падказкі», якія выдалі ў Менск ратаваць свайго гаспадара.

✦ ✦ ✦

Но ніяку скульптуру Леніна ў нашым раёне пакінулі. «Прападыр сусветнага пралетарыяту», што стаіў ля школы № 3 ў Пружанах, ніадбіта разбіты і вывезены на Пясчыну на прычыне адсутнасці пальцаў на правай руцэ.

✦ ✦ ✦

У жніўні праводзіцца ў Пружанах чэрвен пазаны «пасядзенне» сесіі абласнога Савета. Вось чаму ў нашым горадзе спешна беллець і пудраць, латаюць дзіры, ураджэла, у цэнтры горада, пачынаючы з Дома Савета. Пакаўзка ёсць пакаўзка. Старыя бальшавіцкія ўлады ніяковаму — у інтересах і на карысць людзей працаваць ію жожа і не хочэ.

✦ ✦ ✦

Дырэктар свіўгаса «Кожалі» Зінчэнка, асвяцілены бальшавіцкай плесавай барацьбой, на сесіі раённага Савета зарэ патрабаваў выдаліць з залы пасяджанняў запрошаных туды народнага дэпутата гарадскога Савета ад БНФ Сароку Генадзя.

✦ ✦ ✦

Бедная Салецкая ўлада! За усе гады свайго існавання так і не змагла падрыхтаваць хоч Пружанскага раёна спецыяліста ці вхопе прыроды. З-за адсутнасці такога году пасаду цяпер займае былы першы сакратар райкома КПБ Раманю Г. Г. з дыпломам інжынера-механіка.

✦ ✦ ✦

І-ая лінія б. г. на сесіі Вярхоўнага Савета камуністычная большасць парламента (аб'яднанне «Беларусь») спрабавала адхіліць ад улады Старшыню ВС Шушкевіча Станіслава толькі за тое, што ён выказаўся супраць унікання Беларусі ў такім дзіўнай калектыўнай бяспеку і прапанаваў гэта пытанне вынесці на рэферэндум. Выступленні на сесіі прыхільнікаў Шушкевіча былі, як правіла, нетактоўныя, абразлівыя, грубыя. Дзякуючы падтрымцы дэпутаты БНФ Старшыня быў уратаваны.

З усіх канцоў Беларусі ідуць тэлеграмы і пісьмы Старшыні Вярхоўнага Савета Шушкевічу Станіславу, у якіх выказваецца яму падтрымка.

✦ ✦ ✦

Беларусы — самая расіяданая на свеце нацыя, калі 4-х мільёнаў якой жыве па-за межамі Бацькаўшчыны.

✦ ✦ ✦

8—10 лінія прыходзіў першы з'езд беларусаў свету. У Менск з'язджалася 000 дэлегатаў — беларусаў з блізкага і далёкага замежжа. Сярод іх была і выступіць на з'ездзе Ганна Жук-Грышкевіч, уродзэнка Пружан (дзявочае прозвішча Жукоўская), якая жыве ў канадскім горадзе Таронта.

✦ ✦ ✦

Шаноўныя дырэктары, старшыні, начальнікі Запрашае ўвагу на свае сэнсоры. Пагледзіце, што пісіць на сценах. Вы там амаль пазбавіцца любімае раніткі былой так званай прапаганды і атэізму. Гэта і партреты правадыроў пенсіюючай дзяржавы, і замшэлыя лозунгі. І многае іншае. У калідоры, напрыклад, лістаў і сёння вісіць сцэнгазета ў такім выдаленні:

«Решения XXVII с'езда КПСС — в жизнь!
Орган партийной и профсоюзной организаций».

✦ ✦ ✦

У Брэсце на ініцыятыве абласнога аддзялення Беларускага фонду культуры праведзен конкурс на праект помніка у гонар слаўнутай перамогі нашых продкаў пад Грунвальдам. Пераможцам стаў мастак сп. Пайдучык. Яго праект — сімвалічная капліца, якая жа быць устаноўлена на тэрыторыі Берасцейскага замчышча, дзе нехай адбылася гістарычная сустрэча вялікага князя Вітаўта і караля Ягайлы, якія дамаўляліся адносна сумеснага дзеяння супраць крыжакоў.

✦ ✦ ✦

Выпіска са справаздачы, падпісанай Генеральным пракурорам В. Шаладонавым, Старшынёй Кантрольнай палаты В. Сакоўчам, Старшынёй Праўлення Нацыянальнага банка С. Багдановічам, міністрам унутраных спраў В. Ягоравым, старшынёй КДБ Э. Ширноўсай:

Дырэктар КПА г. Пружаны У. Д. Маўчун прыняў абтамабілі, абутранспарт агульным коштам 1310 тыс. руб.

акцыянерному таварыству «Брест—Лада»

Ад рэдакцыі:
На бачыце, шырокае распаўсюджанне атрымаў продаж дзяржаўных вытворчых фондаў недзяржаўным структурам і фізічным асобам без дазволу ўласніка-дзяржавы і пры заніжанай адзнаце іх кошту. Рэспубліка панесла страты ад падобнай незаконнай прадажы 920 млн. руб. (прыблізна ўсяго больш паўтары тысячы прадпрыемстваў і ўстаноў). Вярхоўны Савет пра гэта дакладае.
А што далей?

Аб дэпутацкай некампетэнтнасці і беспрынцыповасці

29 чэрвеня дэпутаты раённага Савета абсалютнай большасцю галасавалі па знішчэнне сада «Плэ банцы» і перадачу гэтай надзычай урадлівай зямлі індывідуальным забудоўшчыкам.

Такое рашэнне парушыць «Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб зямлі» — артыкулы 16, 18, 61.

«Тэарэтычнае» абгрунтаванню забудовы ўрадлівай зямлі катэдзямі далі на сесіі некампетэнтныя людзі, такія, як раённы эрэнтэтар Чарнаўсі і спецыяльны запрошаны сюды Лукуць. Сапраўды кампетэнтных спецыялістаў на садах на сесію, як заўгёды, запрасіць «забыліся».

Здзіўляцца ўсяму гэтаму няма чаго, бо большасць дэпутатаў раённага Савета — гэта начальнікі - намеклатурчыкі, што і сёння знаходзяцца ў палоне бальшавіцкай ідэалогіі. Метады дзейнасці гэтых людзей таксама разнойныя. Для іх «закон, як дышла, куды павярнуў, туды і выйшла.»

Камуністы — яшчэ і майстры знішчаць. Яны знішчалі «ворагаў народа», знішчалі разбурылі храмы, помнікі гісторыі і культуры. Цяпер жа, будучы пры ўладзе, яны бяруцца за знішчэнне унікальнага сада.

ЧАРКАСАВА Г. І.
дэпутат раённага Савета.

Ці можна нашых народных дэпутатаў выбіраць на другі тэрмін?

Амаль тры гады змагаўся ініцыятыўная група жыхароў горада і народных дэпутатаў за тое, каб перайсці прыгарадны 47-гектарны сад «Палябанцы» ў валоданне таму, хто яго стварыў — працоўнаму народу. Было паслана мноства пісьмаў у розныя інстанцыі, а ў артыкулах гаварылася аб адным: сад трэба эберагчы і адкінуць для наступных пакаленняў.

Трэба аддаць даніну павагі і падзякаваць тым народным дэпутатам, якія не галасавалі ў рот стадару Тарасевічу С. В., а ўмёрла стаялі за тое, каб выратаваць унікальны сад (гл. артыкул у «Народнай газеце» № 78-81 ад 30.04.93 «Чтобы «вырастить» коттеджи, надо вырубить сады? . . .»

Вось імёны гэтых сапраўдных выбаршчыкаў працоўнага народа.

Народныя дэпутаты Пружанскага гарадскога Савета:

Бысак А. В., Вакульчык В. М., Вакульскі Ш., А., Гаварыха А. А., Жорах П. І., Жарнаў А. І., Панеціс У. Ш., Сарока Г. А., Сарока М. А., Кіральчук В. І., Лаварук В. А., Пятрацка Г. В., Чатвіцкі У. А., Чыж В. М., Хадаровіч Г. У., Хамідулін Г. Г., Шароў У. М.

Народныя дэпутаты раённага і абласнога Саветаў:

Губараў В. М., Зялевіч С. С., Мікіціч У. М., Сапронаў У. М., Чарнасова Г. І., Сарока М. С.

Калі б у дапамогу гэтай групе выступілі і працоўныя калектывы горада, то, напэўна, удалося б гарадскім выратаваць сад. Бо вельмі ж моцная група народных дэпутатаў выступіла за знішчэнне ўнікальнага сада. Так, 29 чэрвеня абсалютная большасць дэпутатаў райсавета [73 чал.] прагаласавала за гэта знішчэнне. А не ж падтрымліваюць яшчэ тры «высокіх» дэпутаты і палова дэпутатаў гарсавета! Таму і выступае такі аб'ядналы атрад «бацькоў» за тое, каб сад знішчыць, а высокарэнтабельную лямпо-

(працяг на другой старонцы)

Дэпутацкі запыт

25. 06. 93 года на сесіі гарадскога Савета народны дэпутат Жарнаў А. І. звярнуўся да старшыні раённага Савета з наступным запытам:

У 1987 годзе дырэктарам СШ № 3 быў прызначаны Іонін П. М., які спачатку працаваў у камсамоле, а пасля партыйных функцыянерам. Апошні 22 гады — загадчыкам Пружанскага РАНА. Працуючы ў школе, ён правёў сваю абыякавасць да справы і некампетэнтнасць, а ў адносінах з людзьмі — грубасць. Да гэтага часу школа пакуль не мае свайго статуту. У выніку такога кіраўніцтва школа страціла раённыя свае дасягненні. З-за грубасці і хамства дырэктара многія настаўнікі перайшлі ў іншыя школы.

У бягучым годзе Іоніну П. М. споўнілася 60 год. І ён мае права на пэўную пенсію.

Скажыце, паважаны старшыня раённага Савета, ці збіраецеся Вы трымаць на пасадзе дырэктара школы Іоніна П. М., які яўна не справяецца з ускладненымі на яго абавязкамі?

ЖАРНОЎ А.
Дэпутат гарадскога Савета

vytoki.net

Заканчэнне
(пачатак на першай старонцы)

кала аддаць перавагу багацтву з тоўстымі кашельками, каб гэтыя багацці лагчі набываць па месяц, сала сае гэлхі-катэдж, стварыць «Царскае Сяло-2». Вось імёны тых народных дэпутатаў, якія ў адкрытую альбо гулкую ў мабчаннку дэмакратыю эпічнаць уніпальны сіл.

Народных дэпутаты Пружанскага гарадскога савета

Бербенкоў А. В., Гапчэрова М. Н., Дрыч П. Ф., Шукшэвіч А. С., Зверава Н. І., Кашчэнка М. Г., Марцінкевіч Г. А., Малафчук В. В., Мікіцюк А. А., Міцкевіч А. А., Мінюк В. А., Пасевіч В. В., Пасевіч І. В., Стешанок В. В., Трабінаў Г. В., Хвіцо Л. Л., Шчэрба В. В.

Народныя дэпутаты Пружанскага раённага савета

Алмашаў У. Н., Анці Г. К., Астапчук У. І., Асадчук А. Н., Бушкіршка А. Ф., Бярэсцеў В. І., Бялецкі В. М., Барысевіч М. У., Вялюшка У. У., Гроб У. І., Галашэйка У. І., Гайдук Э. Л., Гарадзейчык У. І., Герасцюк В. І., Грыгорык А. А., Грэчэрык В. А., Давідзюк М. М., Дабрагайла М. М., Дзяніцэйчык С. Д., Дзенісаў Л. М., Дзенка А. М., Жураў Л. У., Зазуляк Н. І., Зінчанка А. М., Іванюк Л. Ф., Кавалёў А. А., Лагуцін В. Я., Ліш П. М., Літвінчук Л. В., Лукіянаў П. А., Мацюшэвіч Д. С., Маслейніка В. М., Мінюк П. М., Міхальчук Н. В., Міхасіч І. І., Мяга І. А., Шкульшын В. Я., Навагрудзкі У. В., Пачынчык І. М., Пляўт С. І., Петрась М. В., Плесна М. К., Рабчэнка А. У., Рамановскі А. І., Рэзанка Г. Г., Самайлюк В. У., Сарока В. І., Сідрэка М. У., Сямашко С. Л., Сёмуха А. У., Сітко В. М., Тарасевіч С. В., Казакоў В. М., Казлоў У. У., Кілесік У. В., Канавалаў М. В., Кабрыта В. М., Кагін В. М., Клешчук А. Г., Будзінка У. М., Кузьмін Г. І., Кутаўцаў В. Ф., Кудзінаў В. І., Тарасюк В. І., Тур У. М., Цубін У. В., Цвікевіч М. А., Шчыгрэнка В. А., Шалкін У. А., Юдзіц В. М., Юк У. У., Ярэсько А. І., Яцута М. І.

Народныя дэпутаты абласнога і Вярхоўнага саветаў: Гурскі В. І., Вайцешык А. М., Сямашко І. І.

Вось такія нашы народныя лабранцы, іх мы выбралі сам і з імі кім вымушаны рэшта жыць і працаваць.

Жыхары горада Пружаны: І. ХАДЗЯЕЎ, Т. БІРЮКОВА, М. ЛЫТНЕЎ.

Спыніць праследаванне патрыётаў Беларусі!

Спыніць праследаванне патрыётаў Беларусі!

Па шэрае нашых заходніх і ўсходніх суседзяў Беларусь больш чым дзвесце гадоў не мела сваё дзяржавы. І вось нарэшце Бог літаваўся над імі: распадзіся вялікая ў свеце імперыя — СССР. Беларусь абвясціла сябе незалежнай, нейтральнай дзяржавай. Дабіваецца поўнай незалежнасці — абяцае вожнага грамадзяніна Беларусі, бо толькі ў гэтым наш парэтунак.

Аднак у фоціі час праклінуўбетьчоныя антыбеларускія сілы набіраці супраць незалежнасці і нейтралітету Беларусі. Яны цягнуць нашу рэспубліку ў ваенны саюз, праследуюць беларусаў-патрыётаў у войску.

Міністэрства абароны, якое ўначальнае цяпер зяблік Павел Казлоўскі, пачало праследаваць Згуртаванне беларускіх ваяскоўцаў (ЗБВ). Зволены з войска падпалкоўнік Мікола Статкевіч — старшыня ЗБВ. Замест таго каб падтрымліваць ЗБВ і авіяцца на яго пры стварэнні беларускага войска, весці рацэчную барацьбу з расхраданнем ваяскоўцаў мабілізацыі, Міністэрства абароны пачало праследаванне беларускіх патрыётаў. І галоўную ролю ў гэтай ганебнай справе іграе сам міністр. Калі раней мы тварыліся спіна зямляком, які стаў міністрам, то цяпер расчаравацца, нам соромна за яго. Выказанні і дзеянні ганаровага міністра наводзяць на думку, што ён страціў родную глебу пад нагамі і слепа выконвае чужую злую волю. І атрымліваецца, што Міністэрства абароны не ўмацоўвае незалежнасці і нейтралітэт Беларусі, а падрывае яго.

Мы падтрымліваем «Зварот да грамадзян Беларусі.» («Не дазвол расчараваць і патрыётаў Беларусі»), пад якім 81 подпіс, у тым ліку 50 народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь. Спрод іх і подпіс дэпутата Івана Самайлы, Аўрамы дэпутатаў, Зварот падпісалі Васіль Быкаў, кіраўнікі дэмакратычных партый, вядомыя пучэнцы, дзеячы культуры.

Мы патрабуем неадкладна спыніць праследаванне ЗБВ і адмяніць на работу падпалкоўніка Міколу Статкевіча!

Мы за нейтралітэт Беларусі! «Не» ваенаму саюзу!

Лытвін М., Заяц І., Жагалава Т., Жытко К., Кацуба М., і яшчэ 52 подпісы.

Пенсіянер абласнога значэння

На «заслужаны адпачынак» быў адпраўлены на чарговай сесіі Берасцейскага абласнога савета намеснік старшыні выканкаму Андрэй Гурыночук. Ён набыў вядомасць дзякуючы актыўнай дзейнасці на пасадзе старшыні камісіі па эканоміцы і развіцці рынкавых адносінаў. Гэты спадар «чамусьці» вырашыў, што ў першую чаргу трэба перавесці на новыя формы гаспадарання ўсіх сваё сямейства. Дзеля гэтага сп. А. Гурыночук дапамог ўладкавацца сыну 28-гадоваму сыну ў Берасцейскі цэнтр навукова-тэхнічнае інфармацыі на пасаду дырэктара. Так жа апынуўся і нявестка. Пасля сходу з абласнога бюджэту не без садзеяння сп. А. Гурыночука было перакінута 2 млн. рублёў (гэта было ў 1991 годзе), якія маладыя дырэктары пусцілі ў свой бізнес.

Тым часам сам А. Гурыночук у лютым 1991 года стварыў беларуска-польскае прадпрыемства «Такмаімаграпрэс». Дзе дырэктарам стаў згоны зяць Міхаіл Кубацін. Сямейны бізнес пашыраўся...

У Берасці спадзяюцца, што адстаўка А. Гурыночука дасць магчымасць высветліць некаторыя іншыя загадкавыя факты. Напрыклад, прыкладныя органы вялі ў абтыкванне ніякіх дакумент, складзеных на расейскай і польскай мовах. У іх ад імя абласнога была просьба спрыяць адкрыццю ў Берасці бізнесмену, супраць якога вядзецца цяпер крымінальная справа.

Белы скандал пасляпаў і вакол клуба «Прагрэс» (былой сінагогі). Гэты будынак быў на балансе абласных структураў, адзін не абмяжуецца іншай мэтасцю. Тым не менш ён стаў адзіным цалкам прыватызаваным будынкам у Берасці. І гэта не дзівочы на тое, што модэрнізацыя грамадзянскага ўжо да пачатку яго прыватызацыі патрабавала вярэдзь сінагогу вернікам. У гэтай справе ганадта шмат дзіўных момантаў. Станіўшыся шукаць прадуг, прадстаўнікі мясцовай грамады вырашылі звярнуцца на дапамогу да суседзяў суполкі і міжнародных габрэйскіх арганізацыяў, каб яны паўплывалі на беларускіх чыноўнікаў у справе вяртання былой сінагогі. Міністр замежных спраў П. Крэўчанка ўжо атрымліваў першыя водгукі...

Ужэмкуцны гэтыя ды іншыя факты, у абмяркаванне, мабыць, арахуелі, што вырэтаваць сітуацыю з намеснікам старшыні ўжо немагчымма. Вось і вырашылі «пакараць» сп. Гурыночука на «заслужаны» адпачынак «у сувязі з дасягненнем пенсіённага ўзросту».

Цікава, дзе цяпер усплыве імя А. Гурыночука, у якой камерцыйнай структуры?

Віншэць Пермяковіч.

Перадрук з газеты «Свабода».

Ад рэдакцыі: Мы спадзяемся, што гэты артыкул пацвяніць нашых чытачоў, бо ў свой час А. Гурыночук працаваў у Пружанах на пасадзе старшыні райвыканкама і пакінуў пасля сябе такі-сякі след. Працаваў як пасля і сакратаром Брэсцкага райкома КПБ. Словам, намеснікатурная асоба.

Пра размеркаванне кватэр у „чарнобыльскім" доме

Рашэнне сесіі раённага Савета пр дапае дэпутата Чарнакапай Г. І. было ўспрыйнята камісіяй па размеркаванню размеркавання кватэр у гэтым знаным чарнобыльскім 64-кватэрным доме на вуліцы Інтэрнацыянальнай, 8.

Камісія ўстанавіла, што старшыня Пружанскага гарсавета Трабінаў Р. П. выдаў ордэр на кватэру № 39 на фіктыўнаму дакументу. Дырэктару РВА ЖКГ Шэйку дасталася кватэра № 64 пасьдзячы на тое, што яго раней была кватэра на санітарных нормах дазволіла на пражыванні ў ёй.

Былому старшыні гатэля «Лепінскі шлях» Тарасюку П. М., які жыў у Рогобіну, а зараз працуе ў рыбгаспкане, выдзелена кватэра № 15. Вось як гэта адбылася. Прыяцель пісьма:

«Председателю Пружанского горисполкома тов. Трабінаву Г. П.
Управление сгоз. и продовольствия Пружанского райисполкома просит выделить 3-комнатную квартиру, построенную на долевом участии по средства председ. «Путь Ленина» в 64-квартирном доме по улице интернациональная дом 8 Тарасюку Евгению Николаевичу.

Начальник управления сельского хозяйства и продовольствия
Подпись — Крац.

Председатель профкома
Подпись — Подгорский».

Дарэчы кватэра на пастаянны грошы і без гарэнт дасталася Тарасюку.

Кватэру № 50, якая набудзена на сродкі Кашпаратыва, заняў супрацоўнік КДБ Сергей М. В. У зямлі абяцаў перадаць Кашпаратыву кватэру другога свайго работніка, які пераехаў у Менск, але той прыняў сваю мэці і кватэру не перадаў.

Кватэра № 7 аддадзена начальніку эпідэма-тэхнічнага цэха сувязі раённага вузла сувязі за садзеянне у тэлефанізацыі. А было так. Начальнік упраўлення капітальнага будаўніцтва раўвыканкама прасіў начальніка вузла сувязі аплаціць садзеянне ў тэлефанізацыі абсягаў «чарнобыльскай трагедыі». Той стаўіць умову абяцаць кватэру сувязістаў на лепшую ў чарнобыльскім доме. Дамовіліся. Потым было пісьмо з УКВа ў гарсавет, а старшыня пры выдае ордэр на кватэру № 7 начальніку эпідэма-тэхнічнага цэха сувязі Мікіцюку А. А.

Кватэру № 57 выдалі Дзмітрук А. М. — работніцы фінансавага аддзела, адзінокай. Маці кватэру атрымаў 13.5 м². На нашу погляд, праўа на абмен кватэры яе маці.

Усяўнае пытанне, чаму так пастырна і праз розныя намбінацыі многія, атрымаўшы начальніцкі розных рангаў, стараліся займець кватэру ў «чарнобыльскім доме? А ўсё ў тым, што кватэры ў гэтым доме належнай планрэбіі. Мясцовыя ж улады на забудзь, можаць не на вышыні, натуралі «сваіх» людзей.

ЖАРКОЎ А. І.

дэпутат гарсавета, нач. старшыні пікіеті на закінасці размеркавання кватэр у доме 64.

Калі ж у нас пачнецца сапраўдная зямельная рэформа?

Кожны год за значным святкаваннем Савет Міністраў нашай Рэспублікі ў сваіх пастановах прымае дадатковыя меры па задавальненню патрэбнасці грамадзян у зямельных участках. І кожны год у гэтых пастановах гучаць адны і тыя ж дэкларацыі «выдзяляць патрэбнасцям», «забяспечыць выдзяленне», «перадаць пад агародзы», «заказаць дарогу», «стварыць спецфонды зямлі», «правесці абмеркаванне» і г. д.

Мясцовыя ж улады не толькі не выконваюць пастановы і распараджэнні Савета, але нават на самы Закоды не звяртаюць увагі.

Вось прыклад надзеі жыхароў горада Пружаны.

На прапіку мая 1992 г. спраз год пасля ўнядзення ў дзеянне «Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб зямлі» ўзяжыцвы за горада чатыры гаспадарні на сяменнем выдзелі гарадскаму каля 200 га зямлі і толькі чарэда — на 5 год. Усіх на лаў гарадзкіх на зямельным счэце было больш 3000. Вось і знайшлі мясцовыя ўлады для сябе лёгкі выхад выдзелілі на кожную сямёр не належаныя па Закону 0.1 га, а толькі 0.06 га.

Адзначым, што амаль усе дэпутаты райсавета (а іх жа 75 чалавек) нават не заінтэрэсаваліся перад спадаром Тарасевічам — старшынёй райвыканкама — аб тым, што трэба было б абгрунтаваць гарадзкіх, жадаючых працаваць на зямлі, у агрэгадзіцыя таварыствы, заключыць з кожным таварыствам дагавор аб пастаянным карыстанні агульнымі зямельнымі участкамі. І выдзяліць пры гэтым кожнаму ўдзельніку таварыства не менш 0.1 га зямлі.

Есць на ў нас падрэдакцыі «Кодэкс аб зямлі», есць і «Закон аб таварыствах» — што яшчэ трэба?

Ну, добра: не ўлічылі, не прадбачылі такі нюанс, не ўмацоўвае зямельнага ўчастка. Але ж на памылках вучымся! Дык чаму ж тады на прапіку 1992-93 г. г. амаль ніхто з дэпутатаў райсавета нават не падумаў аб тым, што колькасць сем'яў-пражыванцаў, якім патрэбны ў зямлі, да 1994 г. дасягне 4000? І што трэба гораду стадаставіць дадатковы 400-500 га зямлі з улікам патрэбнасці ў ёй на перспектыву. Ды не забыць пры гэтым гаворкі на сёмчы Рэжыма Шчадрэна.

Але ж бяда ў тым, што у райсавеце не хочуць прымаць рашэнні на юрыдыцы правоўных і правядзіць гэтыя рашэнні ў жыццё.

Трэба ж прадастаўіць для двух гарадзкіх пасёлкаў пашэ рэйна каля 700 га зямлі. Для гэтага патрэбна адабраць ад мяс. нал гаспадарні рэйна каля адзнаго працэнта зямлі, абъядзець асобных каналі у цэльнае зямельнае пасмы, якія акружылі б нашы гарадзкі-пасёлкі.

Каб гэта зрабіць, трэба правесці інструмрацыю зямельную рэформу, у кожнай гаспадарцы перамясціць граніцы землекарыстання. Празумела, гэта вельмі складаная работа. Але ж і «Кодэкс аб зямлі» сабатуецца ўжо на працягу больш двух гадоў, трэба ж калісці браўца за гатрэбную зямельную рэформу. І не падменьшыць ве розныя адгаворкі, бачнасць дзеяннаў і фіктыўнасці справаздачамі. А калі патрэбна, то і дачэць прымяненне «Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях». Гэта значыць, што за некаторых агоб можна і трэба накласці штрафы — і немалыя.

Але ж нашу брацца за ўсё гэта, калі амаль усе дэпутаты райсавета — адданыя слугі намэнклатуры старшыні, дырэктары, члены праўлення? І да лемпчні ім усе нашы Законы, Пастановы і Распараджэнні. Вось і ў гэтым годзе выдзелілі зноў кожнай сямі у часовае карыстанне 0.06 га — і ўсе клопаты!

А у рэйне ж многа зямель, якія выкарыстоўваюцца фельмі дрэнна.

Неабходна гэтыя землі прыбліць к жыхарам гарадоў — пасёлкаў, бо тыя знаходзяцца на Пружанчыне ніяк 40 тысяч — больш паловы насельніцтва рэйна!

Трэба прадастаўляць зямлі гарадзкім у пастаянное карыстанне, а яшчэ лепш — у пастаянное валоданне, а не на 5 гадоў, як гэта робіць зараз, бо яшчэ без усякага абмяркавання дагаворы альбо дакумэнты ангэмі.

І тады у хуткім часе адпадзе патрэбнасць кажнічць пазачэ за мяжой, заключаць дагавор аб калектыўнай бесэры і экспедыцыі за іншых пенсіяліцкіх мер. Атрымала б частковае вырашэнне і праблема бесэрэфа. Перад Беларусі можа і пачнецца добра жыць, пагаспадарыць паўнавартоўнымі гаспадарамі зямлі.

І. ХАДЗЯЕЎ сакратар раённай арганізацыі БСП
У. ШАРОЎ — член БСП

Заснавальнікі: Пружанская рада Беларускага Народнага Фронту «Адраджэнне», Раённая рада Таварыства Беларускай Мовы.

Сябры Сялянскай партыі. Сябры Фонду «Льва Сапегі.»

Рэдакторы: Чарнасаў Г. тел. 2-33-51
Здановіч І. — 2-26-23
Хадзяеў І. — 2-23-87
Жытко К. — 2-31-38
Рачко В. — 2-13-15

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за подбор і дакладнасць прыведзеных фактаў.

БЯСПЛАТНА

Пружанская гарадская друкарня

vytoki.net